Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 110 (28220) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Не проста чытаць. А разумець.

СТАР. 6



## Для працы тэатру патрэбны грошы і талент

СТАР. 9



## Як пражыць 100 гадоў без зайздрасці?

СТАР. 12

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:**

*«У нас сучаснае выбарчае заканадаўства, прычым мы яго пастаянна спрашчаем для ўдзельнікаў выбарчай кампаніі, мадэрнізуем, пераходзім ад такога сацыялістычнага, што называецца, выбарчага працэсу — я маю на ўвазе бясплатнага, бюджэтнага — да такога прыватна-прадпрымальніцкага, капіталістычнага. Калі ў выбарчую кампанію будуць укладвацца грошы. Я спадзяюся, што нашы патэнцыяльныя кандыдаты ў дэпутаты пачнуць укладваць сродкі, і ў нас з'явіцца магчымасць для дадатковых інфармацыйных рэкламных мерапрыемстваў, а кампанія стане больш прыкметнай і цікавай для выбаршчыкаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19823,00 | ▲ |
| Еўра | 22424,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 306,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 793,00 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЛЕТА НА АЎГУСТОЎСКІМ КАНАЛЕ



**У летнія дзянькі, калі сонейка добра прагравае азёрную і рачную ваду, усё больш жыхароў Гродна накіроўваюцца ў бок польскай граніцы — на Аўгустоўскі канал. Для тых, хто любіць цішыню, свежае паветра і лясную прахалоду, у мясцінах абапал канала — сапраўдны рай. У Дамброўцы — гэтак называецца адзін з пунктаў адноўленага канала — для прыемнага баўлення вольнага часу створана цэлая сетка паслуг. Па-першае, на цеплаходзе альбо на байдарках можна здзейсніць «кругасветку», пераадолеўшы з дапамогай шлюзаў розны ўзровень вады, пры гэтым адчуць інжынерную мудрасць старых майстроў. Прагуляцца на катамаране па штучным возеры, парыбачыць, папарыцца ў лазні мясцовай аграсядзібы. А яшчэ пасля сонечных ваннаў гродзенцы любяць адчуць і асалоду ад гідрамасажу, падстаўляючы свае целы пад напорыстыя струмені вады. Гэтую гідрапрацэдуру дае застаўка паміж шчучным возерам і рачулкай Чорная Ганьча.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.** *anatol@zviazda.by*

**Больш здымкаў пра Аўгустоўскі канал глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by.**

■ «Круглы стол»

# УРОКІ 1941-га

## Як пазбегнуць паўтору трагедыі і наколькі гарантуе мір і бяспеку новая Ваенная дактрына, ужо прынятая ў першым чытанні?

**Ужо больш як сем дзесяцігоддзяў наша краіна не ведае, што такое вайна. Тым не менш падзеі Вялікай Айчыннай — а дакладней, яе ўрокі — як ніколі, з'яўляюцца актуальнымі сёння. Падставай для сур'ёзных разваг і даследаванняў выступаюць ваенна-палітычныя падзеі, якія адбываюцца ў свеце.**

Як паказвае гісторыя, своечасова вынесеныя ўрокі могуць папярэдзіць любую трагедыю. Не выпадкова напярэдадні 75-й гадавіны з пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў канферэнц-зале «Звязды» адбыўся «круглы стол» «Урокі 1941-га».

У ім прынялі ўдзел **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і сувязях з СНД Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ, галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр ФЕНЬ.**

СТАР. 4-5




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# ГАЗЕТА ПАВЫШАЕ ЮРЫДЫЧНУЮ ПІСЬМЕННАСЦЬ



**Першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці Вячаслаў ДАНІЛАЎ:**

— Камітэт дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці звязвае з газетай «Звязда» шматгадовае плённае супрацоўніцтва. Публікацыі матэрыялаў, у якіх асвятляюцца вынікі дзейнасці Камітэта, уносяць вялікі ўклад у прафілактыку правапарушэнняў у эканамічнай сферы. Яны спрыяюць і скарачэнню парушэнняў заканадаўства, якія здзяйсняюцца суб'ектамі гаспадарання. Тэматычныя артыкулы таксама павышаюць юрыдычную пісьменнасць чытачоў.

Публікацыі ў газеце «Звязда» шматгранныя. Любыя тэмы, якія асвятляюць журналісты старэйшага беларускамоўнага выдання: палітыка і эканоміка, сацыяльная сфера і ЖКГ, спорт і культура — нязменна выклікаюць вялікую цікавасць у чытачоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*